***Гулбе Т. У., Круцько А. М., Арлова Д. В.***, *настаўнікі пачатковых класаў сярэдняй школы № 16 г. Полацка Віцебскай вобласці*

# Сцяжынкамі Полацкай зямлі
# Віртуальная квэст-экскурсія

Галоўнай задачай сучаснага працэсу навучання стала не перадача гатовых ведаў, а фарміраванне ўменняў атрымліваць і апрацоўваць інфармацыю самастойна. Каб гэты працэс стаў цікавым і займальным, педагогі актыўна выкарыстоўваюць інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі. Адной з такіх тэхналогій з'яўляецца квэст-гульня. Квэсты цікавыя для сучасных школьнікаў. З дапамогай квэста можна не толькі пашырыць кругагляд вучняў, але і навучыць прымяняць на практыцы веды і ўменні, а таксама матываваць для вучэбнай дзейнасці ў цэлым. Адным з напрамкаў квэст-гульні з'яўляецца віртуальная квэст-экскурсія.

Віртуальная квэст-экскурсія — гэта арганізацыйная форма адукацыйнай дзейнасці, якая адрозніваецца ад класічнай экскурсіі віртуальным адлюстраваннем рэальных аб'ектаў. Перавагамі віртуальнай квэст-экскурсіі з'яўляюцца даступнасць, магчымасць паўторнага прагляду, нагляднасць, наяўнасць інтэрактыўных заданняў.

Мы прапануем распрацоўку квэст-экскурсіі «Сцяжынкамі Полацкай зямлі» для III−IV классаў, пры праходжанні якой вучні атрымаюць магчымасць у займальнай форме пазнаёміцца з новым матэрыялам, навучацца выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы, пашыраць свой кругагляд.

Вірутальная квэст-экскурсія «Сцяжынкамі Полацкай зямлі» створана для развіцця ў вучняў цікавасці да гісторыі роднага краю, да культуры і традыцый беларускага народа. Экскурсія з'яўляецца сучасным сродкам для забеспячэння ўмоў развіцця ў вучняў умення атрымліваць і апрацоўваць інфармацыю самастойна з розных крыніц, прымяняць яе ў нестандартных сітуацыях.




**Задачы праекта:**

- садзейнічаць павышэнню якасці працэсу навучання праз выкарыстанне інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій ва ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці;
- садзейнічаць арганізацыі самастойнай і групавой пошукавай дзейнасці;
- стварыць умовы для засваення вучнямі гістарычных звестак аб мінулым Полаччыны;
- садзейнічаць развіццю ўвагі, разумовых навыкаў аналізу, сінтэзу, сістэматызацыі;
- стварыць умовы для развіцця станоўчай вучэбнай матывацыі, пашырэння кругагляду вучняў;
- садзейнічаць фарміраванню патрыятызму, нацыянальнай культуры, адказнасці і захаванню гістарычнага мінулага краіны.

Квэст-экскурсію «Сцяжынкамі Полацкай зямлі» можна знайсці па спасылцы https://sites.google.com/view/kvest-sh16 або па QR-коду.

Сайт з віртуальнай квэст-экскурсіяй змяшчае наступныя ўкладкі.

1. Галоўная старонка.
2. План маршрута.




3. Умоўныя абазначэнні.




4. Правілы квэст-экскурсіі.



5. Квэст-экскурсія.




6. Кантакты.

Квэст-экскурсія змяшчае дзевяць гістарычных аб’ектаў Полаччыны, якія вывучаюць школьнікі на ўроках інтэгрыраванага курса «Мая Радзіма — Беларусь». Наведваючы кожны аб’ект, удзельнікі экскурсіі могуць пазнаёміцца з цікавымі звесткамі, паглядзець відэаролікі, знайсці значэнні невядомых слоў, паняццяў, гістарычных дат. Для таго каб перайсці да наступнага аб’екту, абавязкова трэба выканаць заданне і атрымаць ключ.






Пасля завяршэння квэст-экскурсіі вучні могуць праверыць атрыманыя веды ў віктарыне «Сцяжынкамі Полацкай зямлі» і атрымаць сертыфікат удзельніка.




Асаблівасцю экскурсіі з’яўляецца тое, што ўсе аб’екты размешчаны ў пэўнай паслядоўнасці і, не прайшоўшы адзін аб’ект, не трапіш на наступны.

У ходзе квэст-экскурсіі вучні выконваюць разнастайныя заданні:

1) крыжаванка;
2) гульня «Праўда – няпраўда»;
3) воблака слоў;
4) «Знайдзі пару»;
5) «Згубленае слова»;
6) пазл;
7) філворд.










Для стварэння заданняў мы выкарыстоўвалі наступныя інтэрнэт-сэрвісы і рэсурсы: LearningApps.org, Wordwall.net, Canva.com, Wordart.com.

Віртуальная квэст-экскурсія з’яўляецца інавацыйнай формай навучання, якая змяшчае ў сабе наглядныя, слоўнікавыя, практычныя, праблемна-пошукавыя, актыўныя, інтэрактыўныя метады, метады візуалізацыі.

Дадзены праект можа быць выкарыстаны настаўнікамі пачатковых класаў, гісторыі Беларусі, выхавацелямі групы падоўжанага дня ва ўсіх установах адукацыі, а таксама экскурсаводамі ў турыстычнай дзейнасці.

Віртуальную квэст-экскурсію можна прымяняць у выхаваўчай рабоце і пазакласных мерапрыемствах, прысвечаных Году гістарычнай памяці, Дню пісьменнасці, Дню памяці Ефрасінні Полацкай і інш.

Праект віртуальнай квэст-экскурсіі «Сцяжынкамі Полацкай зямлі» мае свае асаблівасці:

- папулярызуе беларускую мову (увесь матэрыял падаецца на роднай мове);

- мае межпрадметныя сувязі (з урокамі беларускай мовы, матэматыкі, гісторыі, геаграфіі, краязнаўства);
- вучыць дзяцей карыстацца картай (знаходжанне аб’ектаў, іх размяшчэнне);
- уключае значныя гістарычныя месцы і ўплыў славутых дзеячаў на развіццё нашай Радзімы, якія вывучаюцца ў інтэгрыраваным курсе «Мая Радзіма — Беларусь»;
- спрыяе развіццю навыкаў самастойнай навукова-даследчай дзейнасці, навыкаў прымянення ведаў у незнаёмай сітуацыі;
- садзейнічае фарміраванню ў вучняў рэфлексіі сваёй дзейнасці;
- аб’ядноўвае адукацыйны працэс з рэальным жыццём;
- дазваляе наглядна ўявіць вынік сваёй дзейнасці.

Такім чынам, віртуальная квэст-экскурсія з’яўляецца інструментам для развіцця пазнавальнай сферы школьнікаў, навыкаў самастойнай і калектыўнай працы, для выхавання грамадзянскіх і патрыятычных пачуццяў.